**Р.І. КРЫЦУК**
***(Мінск, Беларусь)***

# АНАМАЛЬНЫ СОЛІД З ДЗЯРЖЫНСКАГА СКАРБА

Скарб знойдзены ў 1960-я гг. на «Кальвінскім гарадзішчы» ў г. Дзяржынску. Дзякуючы В. Н. Рабцэвічу, у Нумізматычны кабінет БДУ паступілі 9 манет са скарбу: 4 польскіх паўтарака Жыгімонта III Вазы (1621, 1622, 1623, 1624), лівонскі драйпелькер Хрысціны Аўгусты Вазы (1648), 2 лівонскіх шэляга Хрысціны Аўгусты Вазы (1641, 1647) і 2 манеты-падробкі.

Першая з фальшывых манет (інв. № 8/2078) — гібрыдная падробка (маса — 0,82 г., дыяметр — 1,69 см.) пад шэляг Густава II Адольфа і Жыгімонта III Вазы — на аверсе люстэркавы вензель Густава II Адольфа, на рэверсе скажоныя выявы Арла і Пагоні, легенда не чытаецца.

Другая манета (інв. № 9/2079) — (маса — 0,65 г., дыяметр — 15,6 мм.) выканана з медзі пры дапамозе вальцавальнага станка. На аверсе — вензель Хрысціны Аўгусты Вазы, на рэверсе — вензель курфюрста Прусіі Фрыдрыха Вільгельма. Падобная манета (Buzdugan etc, 1977, № 1073a) атрыбутуецца як чаканка Сучаўскага манетнага двара пры Эўстраціе Дабіжа (1661–1665). Манета з Дзяржынскага скарба адрозніваецца ад манеты каталога іншым выкананнем манаграм і легендай. Яна з’яўляецца малодшай манетай скарба, захаванага, такім чынам, не раней за 1661 г.

*Buzdugan G., Luchian O., Oprescu C. C. Monede şi bancnote româneşti. Bucureşti, 1977.*